EMPOWERING
EHEA Paris 2018
EUROPE'S YOUTH

Conférence ministérielle européenne pour l'enseignement supérieur

bologna process

EUROPEAN Higher Education Area

**Дадатак II**: Стратэгія для Беларусі

## ПРАЕКТ СТРАТЭГІЧНАГА ПЛАНА ДЗЕЯННЯЎ ПА ІМПЛЕМЕНТАЦЫІ ГАЛОЎНЫХ МЭТАЎ РАЗВІЦЦЯ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ, У АДПАВЕДНАСЦІ З ПРЫНЦЫПАМІ І ІНСТРУМЕНТАМІ ЕЎРАПЕЙСКАЙ ПРАСТОРЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

Стратэгічны план дзеянняў грунтуецца на “Канцэптуальных падыходах да развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2020 года і на перспектыву да 2030 года", узгодненых на Рэспубліканскай педагагічнай радзе з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (23 - 24.08.2017 г.) і зацверджаных загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь №742 ад 2017.11.2017 г.

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у межах сваёй кампетэнцыі пацвярджае сваю прыхільнасць далейшай імплементацыі прынцыпаў і інструментаў Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (далей - ЕПВА) у сістэму вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь і сваю гатоўнасць да супрацоўніцтва па гэтых пытаннях з Назіральнай групай Балонскага працэса (далей - BFUG).

*З гэтай мэтай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь бярэ на сябе абавязак:*

- распрацаваць і зацвердзіць у 2018 годзе “Рабочы план па імплементацыі інструментаў ЕПВА у сістэму адукацыі Беларусі” на аснове дадзенага Стратэгічнага плана дзеянняў;

- прызначыць у 2018 годзе Нацыянальную рабочую групу для далейшай імплементацыі інструментаў ЕПВА у сістэму вышэйшай адукацыі Беларусі;

- стварыць у 2018 годзе інфармацыйны Інтэрнэт-партал/вэб-сайт і праводзіць рэгулярныя семінары і канферэнцыі, якія маюць на мэце павышэнне дасведчанасці шырокага кола зацікаўленых бакоў пра працэсы аптымізацыі сістэмы вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

*Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь прапануе BFUG падтрымаць Беларусь у гэтай працы. З гэтай мэтай Міністэрства адукацыі Беларусі звяртаецца да BFUG з наступным запытам:*

- прызначыць у 2018 годзе, па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі Беларусі, склад экспертаў/кансультантаў для Рэспублікі Беларусь, якія будуць мець неабходны досвед і прафесійныя кампетэнцыі. Кожнаму эксперту/кансультанту будзе прапанавана даваць кансультацыі па шэрагу раздзелаў дадзенага Стратэгічнага плана дзеянняў. Місія экспертаў будзе заключацца ў прадастаўленні Беларусі дапамогі ў сферы далейшай імплементацыі інструментаў ЕПВА і далейшым міжнародным супрацоўніцтве ў галіне вышэйшай адукацыі;

- садзейнічаць арганізацыі ў 2018 - 2020 гадах азнаямленчых візітаў спецыялістаў у галіне вышэйшай адукацыі з Рэспублікі Беларусь у адукацыйныя ўстановы (арганізацыі) ЕПВА, якія маюць досвед паспяховай імплементацыі інструментаў ЕПВА;

- задзейнічаць беларускіх экспертаў у галіне рэфармавання вышэйшай адукацыі ў кансультацыях адносна маштабу імплементацыі прынцыпаў і інструментаў ЕПВА у сістэму вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь;

- праводзіць на рэгулярнай аснове бягучыя кансультацыі па абмеркаванні імплементацыі ніжэйпазначаных асноўных мэтаў і задач з вышэйзгаданай Нацыянальнай рабочай групай, міжнароднымі кансультантамі/экспертамі і прадстаўнікамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## Галоўныя мэты і задачы

### *1. Рамка кваліфікацый*

Да пачатку 2018 году Рэспубліка Беларусь распрацавала праект Нацыянальнай рамкі кваліфікацый вышэйшай адукацыі (BelQF) (4-ы крок распрацоўкі нацыянальнай рамкі кваліфікацый). Прымаючы гэта пад увагу, Беларусь бярэ на сябе абавязак прыняць меры па ўвядзенні BelQF да 2019 года і падрыхтоўцы яе самастойнай сертыфікацыі ў 2020 годзе.

Гэтая праца забяспечыць наступнае:

- укараненне сістэмы некалькіх цыклаў вышэйшай адукацыі: са ступенню бакалаўра (180-240 крэдытаў ECTS) і ступенню магістра (90-120 крэдытаў ECTS) і, адпаведна, паступовым згортваннем існуючай 5-гадовай сістэмы навучання на ступень бакалаўра;

- узгадненне нацыянальнай сістэмы класіфікацый адукацыйных праграм (Дзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь "Спецыяльнасці і кваліфікацыі” ОКРБ 011-2009) з Міжнароднай стандартнай класіфікацыяй адукацыі (МСКА, 2011 г.), якая будзе спасылацца на адукацыйныя праграмы BelQF і Рамку кваліфікацый ЕПВА;

- далейшае ўдасканаленне практыкі вымярэння УВА вучэбнай нагрузкі студэнтаў у крэдытах ECTS у адпаведнасці з перагледжаным “Кіраўніцтвам  па выкарыстанні Еўрапейскай сістэмы пераносу і назапашвання крэдытаў” (ECTS), 2015 г.

- прапанову міжнародным экспертам/кансультантам (уключаючы экспертаў з Грузіі, Італіі, Аўстрыі, Германіі, Францыі) даць кансультацыю Беларусі па пытаннях імплементацыі мер, пазначаных у “Плане дзеянняў па распрацоўцы Нацыянальнай рамкі кваліфікацый Рэспублікі Беларусь” (прынятага 04.10.2017 г.). Нацыянальная рамка кваліфікацый вышэйшай адукацыі павінна быць сумяшчальная з Рамкай кваліфікацый ЕПВА.

### *2. Забеспячэнне якасці*

Рэспубліка Беларусь распрацавала канцэпцыю ўвядзення нацыянальнай незалежнай сістэмы забеспячэння якасці вышэйшай адукацыі. Прымаючы гэта пад увагу, Беларусь бярэ на сябе абавязак да 2020 года прыняць меры па далейшым удасканаленні працэдур унутранага забеспячэння якасці ва ўстановах вышэйшай адукацыі і распрацаваць нарматыўна-прававую базу для дзейнасці

незалежнага агенцтва забеспячэння якасці з мэтай пачатку яго поўнамаштабнай дзейнасці да 2022 года.

Дзейнасць, накіраваная на ўсталяванне незалежнай сістэмы забеспячэння якасці вышэйшай адукацыі і падрыхтоўку нацыянальнага незалежнага агенцтва забеспячэння якасці да ўваходжання ў Еўрапейскую асацыяцыю па забеспячэнні якасці вышэйшай адукацыі (ENQA)/Еўрапейскі рэестр забеспячэння якасці вышэйшай адукацыі (EQAR), будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці са Стандартамі і рэкамендацыямі забеспячэння якасці Еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (ESG, 2015 г.).

Міжнародным экспертам/кансультантам (у першую чаргу, прадстаўнікам ENQA/EQAR) будзе прапанавана даць кансультацыю па імплементацыі мер, пазначаных у "Плане дзеянняў па распрацоўцы незалежнай сістэмы забеспячэння якасці вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь" (прынятым 14.02.2017 г.). Распрацоўка і ўмацаванне патэнцыялу сістэмы забеспячэння якасці і дзейнасць вышэйпазначанага нацыянальнага агенцтва павінна ахопліваць усе ўзроўні адукацыі.

## *3. Прызнанне кваліфікацый*

Рэспубліка Беларусь паслядоўна праводзіць мерапрыемствы, накіраваныя на:

- далейшае пашырэнне ўзаемнага прызнання пасведчанняў/сертыфікатаў пра атрыманне адукацыі на аснове адпаведных пагадненняў з рознымі краінамі;

- далейшае ўдасканаленне дзеючай сістэмы прызнання кваліфікацый у адпаведнасці з Лісабонскай канвенцыяй па прызнанні.

Вынік гэтай дзейнасці з'яўляецца станоўчым. Гэта сцвярджаецца ў Справаздачы фламандскага нацыянальнага інфармацыйнага цэнтра акадэмічнага прызнання NARIC (Бельгія) "Справаздача на аснове экспертнай ацэнкі Беларускага цэнтра ENIC" (http://media.ehea.info/file/20171018-19-Rome/11/6/ENIC-NARIC_peer-review_report_ENIC_Belarus_final_877116.docx).

Прымаючы гэта пад увагу, да 2019 года будуць прынятыя меры для паляпшэння інфармацыйнай падтрымкі дзейнасці ENIC-Беларусь (прадастаўленне інфармацыі пра дзейнасць сеткі ENIC - Беларусь на ангельскай мове).

Будзе распрацаваная нарматыўна-прававая база для працэдуры прызнання папярэдняга навучання і працэдуры прызнання кваліфікацый бежанцаў.

## *4. Інструменты празрыстасці*

З 2013 года Рэспубліка Беларусь імплементуе нацыянальную сістэму крэдытных адзінак, якая грунтуецца на ECTS. Прымаючы гэта пад увагу, да 2020 года будуць прынятыя меры па імплементацыі гэтай сістэмы ў адпаведнасці з перагледжаным "Кіраўніцтвам па выкарыстанні ECTS".

Асаблівая ўвага будзе нададзена вынікам навучання і распрацоўцы вучэбных планаў, а таксама ацэнцы і магчымасцям для рэалізацыі праграм акадэмічнай мабільнасці. Гэты працэс будзе грунтавацца на выніках рэалізацыі праекта Erasmus+ " Спрыянне развіццю кампетэнцый ў беларускай вышэйшай адукацыі (FOSTERC)", праект №574087-EPP-1-2016-1-ES-EPPKA2-CBHE-SP.

Нарматыўна-прававая база будзе распрацаваная для выдачы бясплатнага Дадатку да дыплома на некалькіх мовах у фармаце, ухваленым Радай Еўропы, Еўрапейскай камісіяй, ЮНЕСКА (таксама ў лічбавым фармаце) для ўсіх студэнтаў.

Міжнародным экспертам/кансультантам, у тым ліку кансультантам з Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця, будзе прапанавана даць кансультацыю па імплементацыі пераходу да лічбавага фармату Дадатку да дыплома.

## *5. Мабільнасць супрацоўнікаў і студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі, інтэрнацыяналізацыя*

Рэспубліка Беларусь паслядоўна пашырае маштаб міжнароднай акадэмічнай мабільнасці супрацоўнікаў і студэнтаў УВА на аснове адпаведных пагадненняў. Краіна таксама павялічвае колькасць спецыяльнасцяў вышэйшай адукацыі з магчымасцю навучання на ангельскай мове. Прымаючы гэта пад увагу, будзе распрацаваная наступная нарматыўна-прававая база пасля прыняцця новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі:

- для імплементацыі сумесных адукацыйных праграм і праграм, па завяршэнні якіх выдаецца двайны дыплом;

- для прадастаўлення замежным студэнтам адукацыйных грантаў для навучання ва УВА Рэспублікі Беларусь.

З гэтай мэтай у 2019 годзе будзе перагледжана практыка арганізацыі акадэмічнай мабільнасці, з удзелам міжнародных экспертаў/кансультантаў. У 2019 - 2020 гг. установы вышэйшай адукацыі распрацуюць уласныя ўнутраныя працэдуры прызнання вынікаў акадэмічнай мабільнасці.

Акрамя таго, новыя адукацыйныя стандарты (пакалення 3+) забяспечаць уключэнне ў вучэбны працэс акадэмічных семестраў мабільнасці (“вокнаў мабільнасці”).

## *6. Навучанне на працягу ўсяго жыцця і сацыяльнае вымярэнне вышэйшай адукацыі*

Да пачатку 2019 года міжнародным экспертам/кансультантам, у тым ліку з Еўрапейскага фонду адукацыі, будзе прапанавана даць кансультацыі па стварэнні асновы для распрацоўкі нарматыўна-прававой базы, мэтай якой з’яўляецца гарантаванне прызнання папярэдняга навучання, з мэтай распрацоўкі адпаведнай працэдуры ў 2021 годзе.

У Рэспубліцы Беларусь працэдура размеркавання выпускнікоў УВА на працоўныя месцы ажыццяўляецца навучальнымі ўстановамі з мэтай сацыяльнай падтрымкі выпускнікоў і задавальнення патрэбаў эканомікі і сацыяльнага сектара ў спецыялістах, служачых і рабочых. Прымаючы гэта пад увагу, пачынаючы з 2020 года будуць прынятыя дадатковыя меры па сацыяльнай падтрымцы выпускнікоў устаноў вышэйшай адукацыі, уключаючы тых, хто вучыўся на платнай аснове. Акрамя таго, будуць прынятыя меры для вывучэння міжнародных праграм уладкавання на першае месца працы з мэтай распрацоўкі прапаноў для Урада Рэспублікі Беларусь па пераглядзе існуючай сістэмы працоўнага размеркавання выпускнікоў УВА.

## *7. Фундаментальныя каштоўнасці ЕПВА*

З 2011 года былі створаныя і ўкаранёныя абавязкі па ўключэнні супрацоўнікаў і студэнтаў УВА у калегіяльныя кіруючыя органы навучальных установ (у склад Рады УВА павінна ўваходзіць не менш за 25% студэнтаў). З 31.01.2015 г. дзейнічае Грамадская рэспубліканская студэнтская рада, якая можа падаваць свае прапановы ў Міністэрства адукацыі па ўдасканаленні сістэмы падрыхтоўкі, навучання і правядзення вольнага часу. Прымаючы пад увагу ўсё вышэйсказанае, у 2019 - 2020 гадах будуць прынятыя дадатковыя меры па ўключэнні прадстаўнікоў студэнтаў у камісіі па ацэнцы якасці вучэбных праграм і акрэдытацыі УВА.

У 2018 - 2019 гадах установы вышэйшай адукацыі таксама распрацуюць дадатковыя мерапрыемствы па ўдасканаленні механізму ўдзелу студэнтаў і выкладчыкаў у кіраванні УВА.

Будзе распрацаваны парадак вылучэння на конкурснай аснове кандыдатаў на пасаду рэктара ўстановы вышэйшай адукацыі (у адпаведнасці з артыкулам 203 праекта Кодэкса аб адукацыі).

Будзе працягвацца праца па далейшай імплементацыі палажэнняў, выкладзеных у Камюніке канферэнцыі міністраў ЕПВА.

Будзе працягвацца праца па ўключэнні ў нацыянальную сістэму адукацыі прынцыпаў Вялікай хартыі ўніверсітэтаў і рэкамендацый Рады Еўропы (Rec/CV (2012)7), якія датычаць адказнасці дзяржавы за акадэмічную свабоду і інстытуцыйную аўтаномію.

Міжнародным экспертам/кансультантам будзе прапанавана даць рэкамендацыі па імплементацыі мер, накіраваных на развіццё акадэмічнай культуры ва ўстановах вышэйшай адукацыі.

## *8. Імплементацыя*

Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы будзе адказваць за падрыхтоўку і прадастаўленне неабходных дадзеных па імплементацыі інструментаў ЕПВА і правядзенне мерапрыемстваў па дадзеным Стратэгічным плане дзеянняў у фармаце і ў тэрміны, усталяваныя сумесна Міністэрствам адукацыі і BFUG.

## *9. Супрацоўніцтва з BFUG*

Будзе прызначаная дэлегацыя з 2-3 членаў з веданнем ангельскай мовы і неабходнымі кампетэнцыямі для ўдзелу у паседжаннях BFUG і забеспячэння неперарыўнасці прадстаўніцтва Рэспублікі Беларусь цягам усяго перыяду працы групы.

Будзе забяспечаны ўдзел у адпаведных семінарах і мерапрыемствах па калегіяльным навучанні, вылучэнне кандыдатаў на ўдзел у працоўных групах, створаных у рамках працы праграмы EHEA за адпаведны перыяд.

У выпадку, калі вышэйшыя заканадаўчыя і выканаўчыя органы Рэспублікі Беларусь пачнуць уносіць змены ў праграмную палітыку развіцця сацыяльнага сектара, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь можа змяніць умовы імплементацыі мер, пазначаных у дадзеным Стратэгічным плане дзеянняў, што будзе адлюстравана ў “Плане работы па імплементацыі інструментаў ЕПВА у сістэму адукацыі Беларусі”. У гэтым выпадку Міністэрства адукацыі будзе своечасова інфармаваць BFUG пра ўнясенне адпаведных змен для забеспячэння празрыстасці, узаемнага даверу і паразумення.